*Літ.*: Порецкий Я. Соломон Рысинский = Solomo Pantherus Leucorussus: Конец XVI — нач. XVII вв. Мн., 1983.
*Аляксандр Коршунаў.*

**РЫСКІН** (Рыськін) Арон Барысавіч (1899, Рагачоўскі пав. Магілёўскай губ. — 10.4.1984), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Скончыў курсы марксізму ў Маскве (1928). З 1917 на сав. і парт. рабоце ў Рагачоўскім пав., сакратар Магілёўскіх пав. і акруговага, Віцебскага акр. к-таў партыі. Чл. ЦК КП(б)Б у 1924—25, потым ЦКК КП(б)Б. З 1928 на парт. рабоце ў Растове-на-Доне і Нальчыку. У 1929—31 нам. наркома РСІ БССР, член Прэзідыума ЦКК КП(б)Б. У 1931—34 сакратар ЦК КП(б)Б, чл. Бюро ЦК КП(б)Б. Меў дачыненне да *рэпрэсій палітычных* у Беларусі ў 1930-я г. У 1934—37 1-ы сакратар Мінскага гаркома партыі. З мая 1937 1-ы сакратар абкома ВКП(б) Яўр. аўтаномнай вобл. У жн. 1938 арыштаваны органамі НКУС як вораг народа, прыгавораны да зняволення ў папраўча-прац. лагерах. Пасля вызвалення на сав. і гасп. рабоце ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1956.
*Эмануіл Іофе.*

**РЫСКУ́Н**, службовая асоба ў памежных валасцях ВКЛ у 15—16 ст., што сачыла за дзярж. мяжой. Займаўся пагранічнай выведкай, сачыў за пераходам праз мяжу іншаземцаў, дапытваў іх і г.д. Пасада Р. была незалежнай ад намесніка, верагодна, выбіраўся ў валасцях.

*Літ.*: Bardach J. Ryskun i szpieg // Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVII w. Warszawa, 1970.

**РЫТА МАЛАЯ**, гл. ў арт. *Маларыта.*

**РЫТО́Н** (грэч. rhyton, ад rheō цяку), старажытная рогападобная пасудзіна ці рог для піцця з невял. адтулінай у ніжнім вузкім канцы. Р. выраблялі з рогу, металу, гліны, слановай косці і інш., упрыгожвалі рэльефамі і гравіроўкай. Часам яны мелі на канцы скульптурную выяву. Былі вядомы ў насельніцтва крыта-мікенскай культуры (2-е тыс. да н.э.), распаўсюджаны ў Індыі, Персіі, Месапатаміі, Сірыі, Малой Азіі, Рыме, часткова ў Егіпце. У археал. л-ры Р. называюць усе рогападобныя пасудзіны і рагі для піцця віна, мёду і інш. Ужыванне пустацелых у сярэдзіне рагоў для абрадавага напою вядома з глыбокай старажытнасці (барэльефы з выявай жанчыны, што трымае рог у руцэ). Здаўна такі культавы рог лічыўся сімвалам дабрабыту і багацця, што знайшло адлюстраванне ў міфалогіі і фальклоры розных народаў (напр., бел. нар. казка «З рогу ўсяго многа»). У жал. веку знаходкі па-мастацку аздобленых рагоў для піцця адзначаны на археал. помніках Польшчы і Літвы. На бел. этнічнай тэр. (в. Разтолты каля Беластока), у курганным пахаванні *вельбарскай культуры* (2-я чвэрць 1-га тыс. н.э.) знойдзены фрагменты шклянога рога скандынаўскага тыпу. Выява абрадавых рагоў для сакралізаваных напояў сустракаецца на ранняслав. і прускіх каменных стэлах. Выявы рагоў-Р. вядомы на страж. культавых камянях каля в. Сцебракі Вілейскага р-на.
*Эдвард Зайкоўскі.*



**Шкляны рытон** 3—5 ст. н.э. з кургана каля в. Разтолты (каля Беластока). Рэканструкцыя.

**РЫЎЛІН** Езекііль Ісаакавіч (1.12.1901, г. Віцебск — 7.5.1978), бел. гісторык, дзярж. і парт. дзеяч. Акад. АН БССР (1931), праф. (1931). Скончыў Камуністычны ун-т імя Я.Свярдлова ў Маскве (1923), Ін-т чырвонай прафесуры (1927). У канцы 1920 — пач. 1930-х г. дацэнт, праф. у ВНУ Масквы і Мінска. З 1928 прарэктар БДУ, з 1929 нам. наркома асветы БССР. У 1931—32 заг. сектара навукі і культуры ЦК КП(б)Б, чл. Прэзідыума АН БССР, дырэктар Ін-та аспірантуры АН БССР. Арыштаваны 6.3.1933. Пастановай Асобай нарады ад 9.7.1933 прыгавораны да 3 гадоў зняволення, якое пазней заменена высылкай у Алма-Ату. З 1933 жыў і працаваў у Казахскай ССР. 9.5.1956 рэабілітаваны Ваенным трыбуналам БВА. У 1957—59 заг. кафедры рус. мовы і л-ры пед. ін-та ў Кзыл-Ардзе, у 1959—71 заг. кафедры методыкі выкладання рус. мовы і л-ры Казахскага пед. ін-та (з 1971 праф.). Даследаваў гісторыю германскай сацыял-дэмакратыі 1-й пал. 20 ст.

*Тв.*: Аграрная дискуссия в германской с.-д. Мн., 1929.
*Эмануіл Іофе.*

**РЫЦАРСКАЕ ПРАВА**, ваеннае права, сукупнасць юрыдычных норм, якія рэгламентавалі побыт і праваадносіны ў войску ВКЛ. Аналіз асн. прынцыпаў права, яго паходжанне, прызначэнне і падзел на галіны даў Ф.Скарына ў прадмове да кнігі «Другі закон». Адной з галін права ён лічыў права «рыцерское или военное, еже на войне соблюдаемо бываеть». Праваадносіны, што складваліся пры нясенні вайсковай службы, рэгуляваліся сац. становішчам чалавека. Больш цяжкую вайсковую службу неслі *рыцары — баяры, шляхта*, якія павінны былі заўжды быць гатовымі да вайны. Мяшчане забяспечвалі войска зброяй, а таксама ўдзельнічалі ў пабудове і абароне гарадскіх умацаванняў. Тыя з іх, хто меў маёнткі, павінны былі разам з баярамі і шляхтай ісці на вайну або вылучаць замест сябе ратнікаў. Простыя сяляне ў час нападу ворага паводле пастановы сейма вылучалі аднаго ратніка ад некалькіх двароў. У *Прывілеі 1387* вял. кн. Ягайлы адзначана, што ваенны паход (*пагоня*) лічыцца абавязкам кожнага, хто можа трымаць зброю ў руках (гл. таксама *Апалчэнне*). Пісьмовае Р.п. пачало развівацца ў 16 ст. Першымі вайсковымі законамі былі пастановы Навагрудскага (1502), Віленскага (1507), Мінскага (1507) і інш. сеймаў. Кадыфікацыя вайсковага права ажыццёўлена ўпершыню ў *Статуце Вялікага княства Літоўскага 1529*, які вызначыў кола ваеннаабавязаных, прадугледжваў меры пакарання за невыкананне вайсковых абавязкаў і за злачынствы, учыненыя ратнікамі, рэгламентаваў правы і абавязкі гетмана. Ад нясення вайсковай службы вызваляліся толькі цяжка хворыя і няздольныя да яе асобы, але і яны павінны былі вылучаць за сябе прыгонных людзей. Да 1530-х г. быў прыняты шэраг нарматыўных актаў, ажыццёўлена іх сістэматызацыя. Гэта адыграла пэўную ролю ў далейшым развіцці вайсковага права ВКЛ. Падрабязна рэгламентаваны пытанні гэтай галіны права ў *Статуце Вялікага княства Літоўскага 1566* і *Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588*. У 1754 у Нясвіжы зроблена першае сістэматызаванае выданне актаў па вайсковым праве — «Артыкулы вайсковыя».
*Язэп Юхо.*

**РЫЦАРЫ** (ад ням. Ritter коннік), прадстаўнікі прывілеяванай сац. катэгорыі (рыцарства) у краінах Зах. і Цэнтр. Еўропы ў перыяд феадалізму. У шырокім сэнсе — саслоўе свецкіх феадалаў, у вузкім — дробныя свецкія феадалы, конныя воіны, якія рэкрутаваліся з васалаў і за атрыманыя невял. зямельныя маёнткі — феод (лен) прымалі на сябе абавязкі вайсковай службы з поўным рыцарскім узбраеннем у войску ці атрадзе свайго сеньёра. У 10—11 ст. стваралі асобную групу ваеннаслужылых феадалаў, якія ў далейшым афарміліся юрыдычна ў дваранскае саслоўе. Удзельнічалі ў ваенных паходах, у т.л. ў крыжовых, у міжусобіцах феадалаў, у задушэнні паўстанняў сялян і гараджан. Каб стаць Р., трэба было быць дастаткова багатым, мець баявога каня, меч, панцыр, шчыт, шлем і інш. Для пасвячэння ў Р. існаваў спец. рытуал: урачыстае апяразванне мячом, надзяванне шпор, сімвалічны ўдар мячом (рабіў сеньёр у прысутнасці васалаў). Перад пасвячэннем Р. павінен быў паказаць вайсковую вывучку, фізічную сілу, прынесці прысягу аб выкананні патрабаванняў рыцарскага кодэкса, пасля пасвячэння — захоўваць вернасць сеньёру, гатоўнасць абараняць хрысціянскую царкву, дапамагаць слабым і хворым членам рыцарскіх сем'яў, падтрымліваць справядлівасць. Адным з патрабаванняў рыцарскага кодэкса было пакланенне сваёй выбранніцы — жанчыне з